Весці БДПУ. Серыя 1. 2021. № 4. С. 74–77

УДК 81'42

UDC 81'42

# УНУТРАНЫ СВЕТ ЧАЛАВЕКА ПРАЗ ПРЫЗМУ ПСІХАЛАГІЧНЫХ І ЛІНГВІСТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ[1]

# HUMAN INNER WORLD THROUGH THE PRISM OF PSYCHOLOGICAL AND LINGUISTIC RESEARCH

**К. І. Субота,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры замежных моў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

**М. Ю. Чыкіль,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры замежных моў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

**K. Subota,**
*PhD in Philology, Associate Professor of the Department of Foreign Languages, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*

**M. Chikil,**
*PhD in Philology, Associate Professor of the Department of Foreign Languages, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Паступіў у рэдакцыю 18.10.21.

Received on 18.10.21.

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў псіхалагічных і лінгвістычных даследаваннях. На аснове праведзенага аналізу выдзелены асноўныя кампаненты ўнутранага стану індывіда і спосабы іх адлюстравання ў лексіка-семантычнай сістэме мовы. Падчас аналізу звяртаецца ўвага на ключавыя канцэпты культуры і кагнітыўныя аспекты мовы, якія ўплываюць на апісанне ўнутранага свету ў форме знакаў мовы.

*Ключавыя словы*: унутраны свет чалавека, антрапацэнтрызм, метафара, семантычныя катэгорыі, канцэпты ўнутранага свету.

The article considers the features of representation of human inner world in psychological and linguistic research. On the base of the conducted analysis the main components of individual's inner state and the ways of their reflection in lexical-semantic system of language are singled out. In the process of the analysis attention is paid to the key concepts of culture and cognitive aspects of language which influence the description of inner world in the form of language signs.

*Keywords:* human inner world. anthropocentrism, metaphor, semantic categories, concepts of inner world.

Даследаванні ўнутранага свету чалавека праводзяцца ў межах псіхалогіі, філасофіі, лінгвістыкі. На стыках розных навук фармулююцца новыя паняцці і тэорыі. Феномен унутранага свету складаны і неадназначны, таму што кожны чалавек унікальны, ён мае сваю псіхалагічную рэальнасць. Адным з варыянтаў абазначэння цэласнай псіхічнай рэальнасці з'яўляецца паняцце *ўнутранага свету*. У дадзеным артыкуле абмяркоўваецца праблема рэпрэзентацыі ўнутранага свету чалавека ў псіхалогіі і лінгвістыцы ў іх аб'ектыўна існуючай узаемасувязі.

У псіхалогіі доўгі час дамінавала філасофская канцэпцыя «адлюстравання», дзе галоўная ўвага надавалася праблеме правільнага, адэкватнага ўспрымання знешняга прадметнага свету чалавекам. Разам з тым, менавіта ўнутранае жыццё чалавека заўсёды складала прадмет псіхалогіі. Значны ўклад у вывучэнне дадзенай праблемы ўнеслі псіхааналіз З. Фрэйда, аналітычная псіхалогія К. Юнга, індывідуальная псіхалогія А. Адлера і іншыя напрамкі глыбіннай псіхалогіі.

Непасрэдна праблеме феномена ўнутранага свету прысвечаны працы В. Д. Шадрыкава, В. А. Мазілава, ускосна яе даследуюць такія аўтары, як С. Л. Рубінштэйн, К. А. Абульханава, С. К. Нартавых-Бочавер. У псіхалогіі больш распрацаваны напрамкі, якія вывучаюць душэўныя і духоўныя складнікі ўнутранага свету чалавека.

На думку В. Д. Шадрыкава, «перажыванні чалавека праймаюць усе ідэальныя кампаненты псіхічнай дзейнасці. Гэта адносіцца і да вобразаў успрымання, і да інфармацыі памяці, і да працэсаў вырашэння жыццёвых сітуацый і задач. Усе ідэальныя кампаненты псіхалагічнай сістэмы дзейнасці звязаны з перажываннямі. Такім чынам, уся інфармацыя, якая складае ўнутраны свет чалавека, будзе звязана з перажываннямі» [1, с. 69].

Такім чынам, з пункту гледжання тэорыі псіхалогіі, унутраны свет чалавека ўяўляе сабой субстанцыю, заснаваную на патрэбах, інфармацыі і эмоцыях індывіда, якая фарміруецца пры жыцці чалавека на аснове яго індывідуальных уласцівасцяў і якасцяў, і якая адлюстроўвае ўсю разнастайнасць яго быцця.

Унутраны свет, як адзначалася раней, узнікае праз успрыманне суб'ектам яго ўласных патрэб і перажыванняў, і ў далейшым сваім існаванні ён неаддзельны ад патрэб і перажыванняў канкрэтнага чалавека. В. А. Мазілаў лічыць, што біялагічнай асновай, якая рэалізуе структуру ўнутранага свету, з'яўляецца фізіялагічная функцыянальная сістэма паводзін, дзе вылучаюцца і марфалагічна фіксуюцца паасобныя аддзелы нервовай сістэмы чалавека, і перш за ўсё галаўнога мозга. Такім

[1] Артыкул (распрацоўка – у актах укаранення) падрыхтавана пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ДР 20211211).

чынам, калі ўнутраны свет чалавека можа існаваць адносна самастойна ад знешняга свету, то ён не можа быць аддзелены ад чалавека [2, с. 19].

У тэорыі псіхалогіі больш распрацаваны напрамкі, якія вывучаюць душэўныя і духоўныя складнікі ўнутранага свету індывіда. Даследаванні Г. Я. Дзямянёвай дазволілі вылучыць катэгорыі, якія ўяўляюць сабой вербалізаванае суб'ектам утрыманне ўнутранага свету: метафарычны вобраз; характарыстыкі ўнутранага свету як цэлага; паводзіны і дзейнасць; індывідуальныя характарыстыкі носьбіта ўнутранага свету; эмацыйныя з'явы; кагнітыўная сфера; матывацыйная сфера; псіхафізіалагічныя і псіхічныя станы; сістэма светапогляду і суб'ектыўных сэнсаў; знешнія з'явы. Такім чынам, унутраны свет з'яўляецца інтэгральным псіхічным утварэннем, якое ўплывае на ўсё псіхічнае жыццё чалавека. Вобраз унутранага свету рэгулюе адносіны суб'екта з навакольным светам і самім сабой, адбіваецца на самаадносінах і самапазнанні. [3, с. 128].

У сучасных лінгвістычных даследаваннях выкарыстоўваецца антрапацэнтрычны падыход, увага даследчыкаў сканцэнтравана на вывучэнні моўнай асобы як асноўнага прадстаўніка моўнай карціны свету. Карціна свету, як вядома, з'ўляецца сэнсавай асновай, на якой трымаецца ўся лексіка-семантычная сістэма мовы, і ўзнікае ў працэсе ўзаемадзеяння чалавека са знешнім асяроддзем. Акрамя таго, што чалавек – істота сацыяльная, жыве ў грамадстве, узаемадзейнічае з іншымі індывідамі, ён таксама жыве і ў сваім унутраным свеце. Можна сцвярджаць, ўсё тое, што існуе ў знешнім фізічным, матэрыяльным асяроддзі, усведамляецца ў свеце ўнутраным. Чалавек у сваёй свядомасці фіксуе вобраз свету, які рэалізуецца ў форме знакаў мовы. У працэсе адлюстравання рэчаіснасці ў свядомасці чалавека адбываецца праламленне разумовай дзейнасці праз прызму мовы.

Так, на думку Н. Д. Аруцюнавай, да паняцця «ўнутраны свет чалавека» адносяцца яго псіхічныя канстанты, характар, схільнасці, паводзіны, агульная структура асобы, погляды, густы, часавыя псіхічныя і эмацыйныя станы, жаданні, намеры, думкі, здольнасці, аб'ектныя і безаб'ектныя пачуцці [4, с. 763].

У лінгвістыцы даследаванні ўнутранага свету чалавека праводзіліся ў межах сістэмы паняццяў і тэрмінаў канцэпцыі моўнай карціны свету, а таксама і ў іншым кірунку. Даследаванні Л. Г. Бабенка, Л. М. Васільевай, В. У. Вінаградава, В. І. Шахоўскага былі накіраваны на вывучэнне з'яў інтэлектуальнага і эмацыянальнага жыцця чалавека. Са з'яўленнем канцэпцыі моўнай карціны свету, вывучэнне дадзенай праблемы набывае асаблівую актуальнасць. Работы Ю. Д. Апрэсяна, Н. Д. Аруцюнавай, В. М. Тэлія, А. У. Урысон, Т. В. Булыгінай, А. Д. Шмялёва, М. У. Піменавай, В. Д. Старычонка, В. Ю. Шыманскай паклалі пачатак вывучэнню моўнага вобраза чалавека, у прыватнасці, унутранага чалавека [4–9].

М. У. Піменава ў сваім даследаванні звяртае ўвагу на той факт, што ў навуцы пры спробе апісання з'яў унутранага свету выкарыстоўваюць матэрыялістычны падыход. І калі канцэптуальнай сістэме аб'ектыўнага свету ў лінгвістыцы нададзена вялікая ўвага, то ўнутраны свет даследуецца фрагментарна, у выглядзе супрацьпастаўлення свету знешняму (фізічнаму) [5, с. 36]. Даследчык сцвярджае, што моўныя схемы апісання з'яў унутранага свету, як правіла, запазычваюцца са схем апісання аб'ектаў навакольнага свету. Гэта могуць быць часткі чалавечага цела (*галава не варыць* – аб дрэнным розуме; *зусім з галавы вылецела* – аб непамятлівасці) або прадметы, створаныя рукамі чалавека, – артэфакты (*кацялок не варыць* – дрэнна разумець) [8, с. 38].

А. У. Коськіна даследавала шэраг універсальных кагнітыўных і, разам з тым, міжузроўневых семантычных катэгорый: катэгорыю прасторы, суб'екта і аб'екта. З дапамогай гэтых катэгорый, на думку даследчыка, падзеі, з'явы ўнутранага жыцця чалавека прыпадабняюцца знешнім – фізічнаму, прыроднаму і сацыяльнаму свету, яго працэсуальным і прасторава-прадметным характарыстыкам [6, с. 5]. Даследчык прыходзіць да высноў, што складнікі разгледжаных семантычных катэгорый, якія рэпрэзентуюць унутраны свет чалавека, не вычэрпваюцца абагульненымі катэгарыяльнымі значэннямі выпрацаваных у мове граматычных форм і канструкцый, здольных сінтаксічна рэалізавацца ў якасці пэўных канструктыўна-сэнсавых кампанентаў выказвання. Абапіраючыся на выпрацаваную лексіка-граматычную базу, якая пашыраецца ў мове за кошт выкарыстання аказіяльных метафар, арыгінальных вобразных параўнанняў, структурна-семантычнай трансфармацыі ўстойлівых выразаў, кожная з семантычных катэгорый уяўляе сабой сістэму субкатэгарыяльных сэнсаў, размяжоўваюцца абстрактныя паняцці і ствараюць яе вобразна-асацыятыўны патэнцыял [10, с. 18].

Агульнапрынятым лічыцца той факт, што чалавек існуе ў знешнім і ўнутраным свеце адначасова. Знешні свет прынята называць аб'ектыўным, а ўнутраны – суб'ектыўным. У сваім успрыманні чалавек гэтыя два паняцці аб'ядноўвае.

У навуковай літаратуры можна сустрэць тэрмін *унутраны чалавек*, які з'яўляецца сінанімічным паняццю *ўнутраны свет чалавека*. Чалавек у наіўнай карціне свету ўяўляе сабой сукупнасць цела і душы, што суадносіцца з сукупнасцю *знешняга чалавека* і *ўнутранага*

*чалавека*. М. У. Піменава ўводзіць паняцце *духоўны чалавек* – тая частка ўнутранага чалавека, якая належыць духоўнасці [5, с. 45]. Таксама даследчык сцвярджае, што шматвобразнасць унутранага чалавека ў пэўнай культуры дазваляе казаць аб яго функцыянальнай значнасці ў межах гэтай культуры, а прыпісванне яму каштоўнасных якасцей адлюстроўвае значнасць для носьбітаў такой культуры. Такім чынам, знешні і ўнутраны свет чалавек успрымае праз прызму сваёй культуры і мовы. Унутраны чалавек у працы М. У. Піменавай канцэптуалізуецца пры дапамозе вітальных, антрапаморфных і зааморфных прыкмет. Даследчык выявіла і апісала наступныя канцэпты: *душа, сумленне, дух, воля, уяўленне, сэрца, розум* [8, с. 48].

Назвы пачуццяў былі даследаваны і дэталёва апісаны Н. Д. Аруцюнавай. Спецыфіка слоў гэтай групы, на думку даследчыка, заключаецца ў тым, што яны з’яўляюцца абстрактнымі імёнамі, але ў той жа час далёкія і ад прапазітыўнай семантыкі, цесна звязанай з часавымі і відавымі параметрамі, якія характарызуюць падзеі [4, с. 386]. Даследчык сцвярджае, што «апісанне ўнутранага жыцця, у прыватнасці сітуацый унутранага разладу і барацьбы элементаў чалавечай псіхікі, іх адносін з “глабальнай асобай”, патрабуе пэўнага набору атрыбутаў – прыметнікаў і дзеясловаў. Для гэтай мэты не заўсёды прыдатныя словы ў іх прамым намінатыўным значэнні» [4, с. 387]. Таксама Н. Д. Аруцюнава лічыць, што «паколькі ўнутраны свет чалавека мадэлюецца па ўзоры знешняга, матэрыяльнага свету, асноўнай крыніцай псіхалагічнай лексікі з’яўляецца лексіка “фізічная”, якая выкарыстоўваецца на другасных, метафарычных сэнсах» [4, с. 387].

В. М. Тэлія пры даследаванні асацыятыўнай прыроды канататыўных прыкмет звяртае ўвагу, што «канататыўныя прыкметы ёсць і ў імёнах непрадметных з’яў, якія называюць канстанты псіхікі і іх праявы, элементы сферы мыслення, адцягненыя паняцці, створаныя чалавекам (лёс, рок, мараль), аспекты асобы (воля, упартасць, талент), іпастасі чалавека (вораг, раб, ахвяра) і да т. п.» [9, с. 227].

Даследаванні ўнутранага свету праводзіліся таксама і на стыку мовазнаўства і літаратуразнаўства. Ю. В. Казарын, вывучаючы ўнутраны і паэтычны свет паэта Б. Рыжага і абапіраючыся на меркаванні Ю. М. Караўлава і К. Ф. Тарноўскіх, вызначае паняцце *ўнутраны свет* як «ментальную мадэль свету псіхалагічнага, інтэлектуальнага, духоўнага і мастацкага (паэтычнага) характару, сфарміраваную ў працэсе анталагічнага і мастацкага (паэтычнага) пазнання. Дадзеная сістэма дэнататыўна-сігніфікатыўных і пачуццёвых уяўленняў мае часавыя, прасторавыя, антрапалагічныя і інтэнцыяльныя параметры, якія забяспечваюць магчымасць пашырэння, ускладнення, абстрактызацыі або канкрэтызацыі і мабільнасці гэтай складанай з’явы, абумоўленай працай уяўлення, фантазіі. Унутраны свет – гэта сістэма канцэптаў і канцэптасфер (у кагнітыўных адносінах), а таксама парадыгмы вобразаў, уяўленняў і паняццяў. Унутраны свет ёсць нейкі першасны стан свету мастацкага і паэтычнага» [11, с. 12].

Увагу літаратуразнаўцаў прыцягваюць асаблівасці ўспрымання свету кожным асобным індывідам. А. С. Фядотава ў сваёй манаграфіі «Інтраспекцыя персанажа англамоўнай мастацкай прозы – новая катэгорыя тэксту» разглядае інтраспекцыю як «праяву ўнутранага свету чалавека, які прадстаўляе сабой складаны і шматгранны працэс адлюстравання розных бакоў разумовай і эмацыйнай жыццядзейнасці індывіда. Сюды ўваходзяць пазнавальныя працэсы (адчуванні, успрыманні, праца памяці, уяўленні), валявыя і эмацыйныя, а таксама праявы разнастайных псіхічных уласцівасцяў асобы» [12, с. 9]. Ключавым паняццем даследавання стала паняцце інтраспекцыі персанажа – «з’явы, калі персанаж фіксуе ўвагу на сваім унутраным інтэлектуальным, эмацыйным і фізічным стане, абдумвае і ацэньвае падзеі, што адбываюцца, і навакольных людзей, аналізуе матывы сваіх дзеянняў і ўчынкаў» [12, с. 7].

На нашу думку, на дадзеным этапе развіцця лінгвістыкі асабліва актуальнымі з’яўляюцца працы, у якіх аналізуюцца ключавыя канцэпты культуры і кагнітыўныя аспекты мовы, у тым ліку і кагнітыўная інтэрпрэтацыя носьбітаў розных моў фрагментаў свайго ўнутранага свету. На матэрыяле гэтых адзінак адбываецца даследаванне спосабаў прадстаўлення канцэптаў сферы ўнутранага свету і іх прыкмет. Канцэпт як складаны комплекс прыкмет мае шматузроўневую рэпрэзентацыю ў мове.

На думку лінгвістаў, найбольш інфарматыўным з гэтага пункту гледжання выступае лексічны ўзровень, так як, абапіраючыся на гэты ўзровень даследавання, магчыма выявіць шэраг семантычных кампанентаў, якія фарміруюць структуру таго ці іншага канцэпта. Метафары часта выкарыстоўваюцца для апісання ўнутранага свету, яны з’яўляюцца важным сродкам, дазваляюць высветліць абстрактныя паняцці, якія прадстаўляюць сістэму ўнутранага свету чалавека.

Такім чынам, мы бачым, што феномен унутранага чалавека складаны і неадназначны. Даследаванні дадзенай з’явы праводзяцца ў межах розных навук. Рэпрэзентацыя ўнутранага свету чалавека ў псіхалагічных і лінгвістычных даследаваннях мае свае асаблівасці. Увагу літаратуразнаўцаў прыцягваюць асаблівасці ўспрымання свету кожным асобным індывідам. Псіхалагічныя даследаванні дазволі-

лі вылучыць катэгорыі, якія ўяўляюць сабой вербалізаванае суб'ектам утрыманне ўнутранага свету.

Унутраны свет з'яўляецца інтэгральным псіхічным утварэннем, якое ўплывае на ўсё псіхічнае жыццё чалавека. Як паказала тэарэтычнае даследаванне, душэўныя, духоўныя складнікі, ключавыя канцэпты культуры і кагнітыўныя аспекты мовы ўплываюць на апісанне ўнутранага свету ў форме знакаў мовы.

*Літаратура*


1. *Шадриков, В. Д.* Мир внутренней жизни человека / В. Д. Шадриков. – М. : Логос, 2006. – 393 с.
2. *Мазилов, В. А.* Предмет психологии: версия для XXI века / В. А. Мазилов // Вестник интегративной психологии. – 2017. – № 1. – С. 16–23.
3. *Деменёва, А. Е.* Образ внутреннего мира и особенности его актуализации / А. Е. Деменёва // Вестник Костромского государственного университета. Серия: Педагогика. Психология. Социокинетика. – 2010. – № 4. – С. 127–130.
4. *Арутюнова, Н. Д.* Язык и мир человека / Н. Д. Арутюнова. – М. : Школа «Языки русской культуры»: I–XV, 1999. – 896 с.
5. *Урысон, Е. В.* Проблемы исследования языковой картины мира: Аналогия в семантике: монография / Е. В. Урысон. – М. : Книга по Требованию, 2019. – 224 с.
6. *Стариченок, В. Д.* Образ человека в белорусском языковом континууме: монография / В. Д. Стариченок. – Минск : Колорград, 2018. – 292 с.
7. *Шыманская, В. Ю.* Метафарычная рэпрэзентацыя псіхалагічнай сферы чалавека ў беларускай і англійскай мовах (на матэрыяле субстантываў) / В. Ю. Шыманская. – Мінск : РІВШ, 2016. – 124 с.
8. *Пименова, М. В.* Концепты внутреннего мира (русско-английские соответствия) : дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01/ М. В. Пименова. – СПб., 2001. – 497 с.
9. *Телия, В. Н.* Коннотативный аспект семантики номинативных единиц / В. Н. Телия. – М. : Наука, 1986. – 242 с.
10. *Коськина, Е. В.* Внутренний человек в русской языковой картине мира: образно-ассоциативный и прагмастилистический потенциал семантических категорий «пространство», «субъект», «объект», «инструмент» : дис. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Е. В. Коськина. – Омск, 2004. – 200 с.
11. *Казарин, Ю. В.* Внутренний мир и миры Бориса Рыжего : [монография] / Ю. В. Казарин. – Екатеринбург : Кабинетный ученый, 2018. – 234 с.
12. *Федотова, О. С.* Интроспекция персонажа англоязычной художественной прозы – новая категория текста: монография / О. С. Федотова. – Рязань : Рязанский гос. ун-т им. С. А. Есенина, 2009. – 140 с.


*References*


1. *Shadrikov, V. D.* Mir vnutrennej zhizni cheloveka / V. D. Shadrikov. – M. : Logos, 2006. – 393 s.
2. *Mazilov, V. A.* Predmet psihologii: versiya dlya XXI veka / V. A. Mazilov // Vestnik integrativnoj psihologii. – 2017. – № 1. – S. 16–23.
3. *Demenyova, A. E.* Obraz vnutrennego mira i osobennosti ego aktualizacii / A. E. Demenyova // Vestnik Kostromskogo gosudarstvennogo universiteta. Seriya: Pedagogika. Psihologiya. Sociokinetika. – 2010. – № 4. – S. 127–130.
4. *Arutyunova, N. D.* Yazyk i mir cheloveka / N. D. Arutyunova. – M. : Shkola «Yazyki russkoj kul'tury»: I–XV, 1999. – 896 s.
5. *Uryson, E. V.* Problemy issledovaniya yazykovoj kartiny mira: Analogiya v semantike: monografiya / E. V. Uryson. – M. : Kniga po Trebovaniyu, 2019. – 224 s.
6. *Starichenok, V. D.* Obraz cheloveka v belorusskom yazykovom kontinuume: monografiya / V. D. Starichenok. – Minsk : Kolorgrad, 2018. – 292 s.
7. *Shymanskaya, V. Yu.* Metafarychnaya reprezentacyya psihalagichnaj sfery chalaveka u belaruskaj i anglijskaj movah (na materyale substantyvau) / V. Yu. Shymanskaya. – Minsk : RIVSh, 2016. – 124 s.
8. *Pimenova, M. V.* Koncepty vnutrennego mira (russko-anglijskie sootvetstviya) : dis. … d-ra filol. nauk: 10.02.01/ M. V. Pimenova. – SPb., 2001. – 497 s.
9. *Teliya, V. N.* Konnotativnyj aspekt semantiki nominativnyh edinic / V. N. Teliya. – M. : Nauka, 1986. – 242 s.
10. *Kos'kina, E. V.* Vnutrennij chelovek v russkoj yazykovoj kartine mira: obrazno-associativnyj i pragmastilisticheskij potencial semanticheskih kategorij «prostranstvo», «sub"ekt», «ob"ekt», «instrument» : dis. … kand. filol. nauk : 10.02.01 / E. V. Kos'kina. – Omsk, 2004. – 200 s.
11. *Kazarin, Yu. V.* Vnutrennij mir i miry Borisa Ryzhego : [monografiya] / Yu. V. Kazarin. – Ekaterinburg : Kabinetnyj uchenyj, 2018. – 234 s.
12. *Fedotova, O. S.* Introspekciya personazha angloyazychnoj hudozhestvennoj prozy – novaya kategoriya teksta: monografiya / O. S. Fedotova. – Ryazan' : Ryazanskij gos. un-t im. S. A. Esenina, 2009. – 140 s.